У чым сустракаць Новы год і што паставіць на стол?

СТАР.4

Карысная цацка для дарослага чалавека

СТАР.5

Ці бывае дружба паміж мужчынам і жанчынай?

СТАР.6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 СНЕЖНЯ 2013 г. СУБОТА № 244 (27609) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Прэзідэнт узяў удзел у навагоднім дабрачынным свяце для дзяцей

НАША БУДУЧЫНЯ — У РУКАХ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Будучыня Беларусі — у руках падрастаючага пакалення. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы навагодняе дабрачыннае свята ў рамках акцыі «Нашы дзеці», якое адбылося ў Палацы Рэспублікі 27 снежня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Якім будзе заўтра Беларусі, залежыць толькі ад вас, ад вашага розуму і сэрца, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У кожнага з нас свае навагоднія надзеі. Але ва ўсіх ёсць адно агульнае жаданне. І гэта жаданне — быць больш шчаслівым».

Прэзідэнт адзначыў, што «ў гэтыя цудоўныя дні не ўсе на планеце такія шчаслівыя і прыгожыя, як вы». «Вось і ў гэтыя хвіліны хтосьці з вашых замежных равеснікаў сціскаецца ад страху пад бамбёжкамі, а камусьці няма чаго есці. Вы надзейна абаронены ад такіх бед, таму што нарадзіліся і выхоўваецеся ў мірнай спакойнай краіне — краіне, якой ёсць чым ганарыцца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы ганарымся непаўторнай прыродай з самымі вялікімі ў Еўропе пушчамі і чыстымі азёрамі. Нашымі культурай, песнямі, казкамі, кнігамі. Мінулым з яго легендамі і паданнямі, замкамі і старажытнымі гарадамі. Подзвігамі абаронцаў Айчыны. І сучаснай Беларуссю, якую ўпрыгожваюць многія цудоўныя новабудоўлі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы атрымалі гэту зямлю ад продкаў як каштоўны дар і прымножылі яго сваёй працай».

Прэзідэнт таксама падкрэсліў: «Вы можаце выбраць любую з дзясяткаў жыццёвых дарог, да якой ляжыць ваша душа. Для тых, каму цесна ў рамках звычайнай школьнай праграмы, адкрыты гурткі, гімназіі, ліцэі. Для юных талентаў створаны школы мастацтваў. У распараджэнне пачынаючых спартсменаў прадастаўлены стадыёны, басейны і лядовыя арэны, і вы спаўна можаце скарыстацца прадастаўленымі магчымасцямі».

Звяртаючыся да бацькоў, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Ніякія забавы і цацкі ў вачах дзіцяці не маюць такой каштоўнасці, як размовы з бацькамі. Таму хочацца папрасіць тых дарослых, якія чуюць мяне цяпер, — не пашкадуйце часу на тое, каб у гэтыя зімовыя дні пабыць са сваімі дзецьмі. Разам схадзіце на ранішнік, у кіно або на каток, пачытайце кнігу перад сном і нават проста пагаварыце шчыра. Ваша бацькоўская любоў — самы дарагі падарунак».

«А яшчэ Новы год і Раство — гэта час, калі мы вучымся міласэрнасці і спачуванню», — адзначыў Прэзідэнт. Ён пажадаў, каб у рамках акцыі «Нашы дзеці», якая праходзіць па ўсёй краіне, свята прыйшло да кожнага дзіцяці.

Для юных гасцей на сцэне разгарнуўся казачны паказ з Дзедам Марозам, які прыехаў з Белавежскай пушчы, каб паказаць дзецям чароўную казку.

Аляксандр Лукашэнка разам з дзецьмі паглядзеў святочны паказ. Ад імя Прэзідэнта ўдзельнікам спектакля былі ўручаны кветкі, а кожнаму дзіцяці — святочныя падарункі. Дзеці ў сваю чаргу ўручылі кіраўніку дзяржавы зробленыя сваімі рукамі пано з навагоднімі матывамі і дэкаратыўнага Снегавіка.

На галоўную ёлку краіны былі запрошаны 2370 дзяцей ва ўзросце 8–14 гадоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. У склад дэлегацыі былі ўключаны дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, выхаванцы дзіцячых інтэрнатных устаноў, дзеці-інваліды; дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў; выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў; дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і фінансавых расследаванняў, бацькі якіх загінулі або сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў; дзеці, якія пацярпелі ад наступстваў катастрофы на ЧАЭС; вучні, узнагароджаныя па выніках раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў; вучні, якія маюць поспехі ў грамадскай рабоце; вучні Беларускай сярэдняй школы імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе.

Фота БЕЛТА.



ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама

«Мадэрнізацыя павінна стаць вырашальным фактарам павышэння канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў. У выніку рэалізацыі намечанага комплексу мерапрыемстваў па мадэрнізацыі вобласць павінна дасягнуць у 2014 годзе выручкі на аднаго сярэдняспісачнага работніка Br611 млн (рост у 1,3 раза), сярэднямесячнай намінальнай заработнай платы Br5570 тыс. (рост у 1,2 раза). На фоне дэфіцыту крыніц фінансавання вялікую значнасць набывае ўдасканаленне вытворчага працэсу, аптымізацыя колькасці і структуры выдаткаў, удасканаленне мер стымулюючага характару. Усяго ў вобласці на перыяд 2013—2015 гадоў запланавана да мадэрнізацыі больш за 700 арганізацый прамысловасці».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.12.2013 г.

Долар ЗША	9500,00	▲
Еўра	13070,00	▲
Рас. руб.	291,00	▲
Укр. грыўня	1150,12	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+7°
Віцебск	+3°
Гомель	+4°
Гродна	+5°
Магілёў	+3°
Мінск	+3°

■ Нашы дзеці

КАЛІ НЕМАГЧЫМА БЫЦЬ АБЫЯКАВЫМ

На навагодні ранішнік у Ждановіцкім дзіцячым доме для дзяцей з асаблівасцямі развіцця ў межах рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» павіншаваць выхаванцаў прыехалі Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль РУБІНАЎ і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана ГЕРАСІМОВІЧ.

Фота БЕЛТА.

Выхаванцы паказалі гасцям казачнае прадстаўленне. Пад апладысменты гледачоў здзяйсняліся навагоднія цуды: зазіхацела ялінка, з'явіліся Дзед Мароз са Снягурачкай, і нават Баба Яга вярнула дзятве ўкрадзеныя падарункі. Дарэчы, госці не толькі назіралі святочны канцэрт звонку, але і самі разам з дзецьмі вадзілі карагоды вакол ёлкі і спявалі песні.

Пасля такой дзеі Старшыня Савета Рэспублікі не ўтойваў пачуццяў і прызнаўся, што эмоцыі перапаўняюць яго.

«На гэтым свяце немагчыма быць абыякавым, — сказаў Анатоль Рубінаў. — Краіна ацэньваецца па стаўленні да дзяцей і старых: калі ў ёй пра іх клапоцяцца — гэта самая лепшая краіна. У нас ні адно дзіця не застаецца на Новы год без падарункаў, а гэта сведчыць пра вялікую сардэчнасць нашага народа. Сёння свята не толькі для гэтых дзетак, але і для мяне».

Анатоль Рубінаў згадаў і сваё ваеннае і пасляваеннае дзяцінства, заўважыўшы, што яно было не такім шчаслівым, як у сённяшніх малых. Старшыня Савета Рэспублікі пажадаў дзецям быць здаровымі, прыгожымі і шчаслівымі, як у гэты святочны дзень, і падарыў ім цацкі і салодкія ласункі. А выхаванцы дзіцячага дома павіншавалі гасцей і ўручылі прыгожыя навагоднія ёлачкі, зробленымі сваімі рукамі.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Мінскі раён.

Фота БЕЛТА.

Учора Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА наведаў з працоўнай паездкай Докшыцкі раён Віцебскай вобласці.

Выступаючы на цырымоніі адкрыцця фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў горадзе Докшыцы, спікер ніжняй палаты беларускага парламента адзначыў, што на яго будаўніцтва практычна не прыцягваліся сродкі раённага бюджэту. «Радасна, што завяршылі гэтую добрую справу напярэдадні навагодняга свята. Комплекс знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці са школай і злучаны з ёй пераходам, каб дзецям было зручна займацца тут, умацоўваць здароўе і ставіць спартыўныя рэкорды», — падкрэсліў ён.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама звярнуўся з просьбай да кіраўніцтва раёна: «Важна, каб тут быў добры кіраўнік, сапраўдны гаспадар, які будзе сачыць за тэхнічным станам і ўтрымліваць гэта складанае збудаванне ў ідэальным парадку. Пры гэтай умове комплекс будзе працаваць доўга і дапаможа ўмацаваць здароўе і дамагчыся добрых спартыўных вынікаў вялікай колькасці людзей».

Потым Уладзімір Андрэйчанка пабываў у Бягомльскай дапаможнай школе-інтэрнаце Докшыцкага раёна, каб асабіста павіншаваць выхаванцаў з навагоднім святам. І гэта ўжо стала традыцыяй.

Спікер беларускага парламента штогод у рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» прыязджае сюды. У інтэрнаце жывуць хлопчыкі і дзяўчынкі не толькі з Докшыцкага раёна, але і з іншых раёнаў Віцебшчыны. І кожны з іх атрымаў салодкі падарунак, а ўсе разам — мультымедыйную ўстаноўку.

— Мы, дарослыя, незалежна ад таго, дзе знаходзяцца дзеці (у дзіцячым садку, у бальніцы ці ў дзіцячым прытулку), павінны праявіць увагу да іх, стварыць ім казачны настрой, а таксама парадаваць падарункамі, — гэтыя словы Уладзіміра Андрэйчанкі вельмі добра раскрываюць мэту акцыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КОРАТКА

1 студзеня сярэдняя сутачная тэмпература паветра (кліматычная норма) складзе каля мінус 6,3 градуса. «Раз у пяць гадоў гэты паказчык бывае вышэйшым за 0 градусаў, прыкладна кожны другі год — вагаецца ў межах ад 0 да мінус 10 градусаў, раз на чатыры гады тэмпература апускаецца яшчэ ніжэй, пры гэтым раз на 20 гадоў — ніжэй за 20 градусаў марозу».

Бакінскі музей мініяцюрнай кнігі папоўніўся экзэмплярам беларускага выдання вершаў Леаніда Дранько-Майсюка. Гэту кнігу падарыла музею з асабістага архіва намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын Рэгіна Давідовіч.

У Беларусі сярэдні памер назначаных пенсій у лістападзе 2013 года склаў Br2 млн 206,7 тыс., што ў 2,5 раза перавышае бюджэт пражыткавага мінімуму для пенсіянераў.

Аляксандр Кудраўцаў і Настасся Верамеенка прызнаны лепшымі баскетбалістамі Беларусі 2013 года.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МВФ ПАТРАБУЕ ДЭВАЛЬВАВАЦЬ УКРАІНСКУЮ ВАЛЮТУ Ў 1,5-2 РАЗЫ

Патрабаванне Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) аб дэвальвацыі грыўны прывядзе да падзення яе курсу ў 1,5-2 разы, заявіў прэм'ер-міністр Украіны Мікалай Азараў. «Гэта прывядзе да росту цэн на імпарт у 2 разы», — сказаў прэм'ер у пятніцу ў эфіры Першага нацыянальнага тэлеканала.

ЗША ВЫДАТКУЮЦЬ НА ЯДЗЕРНУЮ ЗБРОЮ 355 МЛРД ДОЛАРАЎ

Бюджэтнае ўпраўленне кангрэса ЗША апублікавала інфармацыю аб выдатках на падтрыманне ў баявым стане наяўных ядзерных узбраенняў і іх носьбітаў і на распрацоўку новых. Так, у 2014-2023 гг. на гэтыя мэты будуць выдаткаваны 355 млрд долараў. Пасля 2023 выдаткі на ядзерную зброю будуць павялічвацца, паколькі Міністэрства абароны ЗША пачне купляць новыя носьбіты і боезарады.

БАНДЫ САНТА-КЛАУСАЎ РАБУЮЦЬ ЮВЕЛІРНЫЯ КРАМЫ Ў АЛБАНІІ І КОСАВА

Злачынцы, пераапранутыя Санта-Клаусамі, падчас калядных свят здзейснілі два ўзброеныя налёты на ювелірныя крамы ў Албаніі і Косава. Як паведамілі прадстаўнікі албанскага МУС, першы інцыдэнт адбыўся ў аўторак у Тыране: чацвёра зламыснікаў у касцюмах Санта-Клауса ўварваліся ў ювелірны магазін пры адным з гандлёвых цэнтраў албанскай сталіцы і, пагражаючы ўладальніку аўтаматамі, вынеслі вялікую колькасць каштоўнасцяў. Ужо ў чацвер банда з трох «Санта-Клаусаў» абрабавала ювелірную краму ў косаўскім горадзе Прызрэн. Падчас гэтага налёту былі паранены два чалавекі. Пакуль не ясна, ці з'яўляюцца гэтыя рабаванні справай рук адной банды, або розныя злачынныя групоўкі незалежна адна ад адной вырашылі скарыстацца для маскіроўкі калядным ажыятажам.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 13244

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

УМЕРАНАЕ СПАЖЫВАННЕ СПІРТНЫХ НАПОЯЎ — ЗАЛОГ ШЧАСЛІВАГА ІНТЫМНАГА ЖЫЦЦЯ?

Аўстралійскі Інстытут медыцынскіх даследаванняў даказаў, што алкаголь пазітыўна ўплывае на сексуальнае жыццё. Як перадае «BFM.RU», навукоўцы высветлілі ў некалькіх тысяч чалавек, якім напоям яны аддавалі перавагу і ў якім аб'ёме іх спажывалі. Таксама аналізаваўся ўзровень палавой актыўнасці.

Аказалася, што людзі, якія спажываюць спіртное ва ўмераных аб'ёмах, на 30% радзей сутыкаліся з праблемамі ў інтымнай сферы. Ідэальная доза — 4-5 порцый спіртнога ў тыдзень. З ёй мужчына абаронены ад эрэктыльнай дысфункцыі. Таксама людзі, якія выпівалі ў выхадныя і на свята, радзей пакутавалі ад сексуальных расстройстваў пры параўнанні з людзьмі, якія выпіваюць максімум раз у тыдзень. А вось алкаголікаў амаль у 100% выпадкаў чакаюць праблемы ў сексуальным плане, прадракаюць даследчыкі. Самыя сур'ёзныя адхіленні фіксаваліся менавіта ў гэтай групы людзей. Дарэчы, з аналагічнай сітуацыяй сутыкаюцца і былыя алкаголікі.

■ «Прамая лінія»

Надзея ЕРМАКОВА:

«З УВЯДЗЕННЕМ АДЗІНАЙ ВАЛЮТЫ СПЯШАЦЦА НЕ ТРЭБА…»

У нашай газеце адбылася «прамая лінія» з удзелам старшыні праўлення Нацыянальнага банка Надзеі Ермаковай. Кіраўнік Нацбанка адказала на пытанні больш чым 20 чалавек. Надзея Андрэеўна не толькі кансультавала, але і рэальна дапамагла некалькім нашым чытачам у вырашэнні іх праблем. Так, спадарыня Ніна Нядзелька са Слуцкага раёна распавяла аб сваёй складанай сітуацыі, звязанай з валютай: «Ніколі не звязвалася з гэтымі доларамі. А тут знаёмыя параілі: маўляў, купі, — казала яна са слязьмі ў голасе. — Набыла іх у ларку на рынку. А нядаўна дачцэ спатрэбіліся грошы, і я пайшла ў банк тыя долары памяняць зноў на рублі. Але адну банкноту ў сто долараў у мяне не прынялі…»

Надзея Ермакова:

— Не трэба плакаць, даражэнькая мая. Калі ў вас банкноту не ўзялі, значыць, яна крыху пашкоджана. Каб вырашыць гэтую праблему, вам неабходна звярнуцца ў мясцовае аддзяленне Беларусбанка. Пакіньце мне свой нумар тэлефона. Я даручу сваім спецыялістам, каб яны звязаліся з гэтым аддзяленнем, а потым патэлефанавалі вам і сказалі, калі лепш туды падысці.

БАНКАЎСКІЯ КАРТКІ «ПАСЯБРУЮЦЬ» З РЫНКАМІ І ТАКСІ

Анатоль Балік, г. Кобрын:

— Я жыву ў невялікім гарадку, атрымліваю (як амаль усе сёння) зарплату на картку Беларусбанка. Але не ва ўсіх крамах і службах можна ёю расплаціцца. Калі, нарэшце, сістэма безнаяўных разлікаў будзе ўкаранёна ва ўсіх сферах?

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Н. Е. — Мы плануем, што за 2014 год ва ўсіх гандлёвых пунктах, нават на рынках, павінны з'явіцца тэрміналы з бесправадной сувяззю.

СТАР.2